**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Першы праэктар установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»
к. эк. н., дацэнт
__________ Г.У. Садоўская
“15” ______________ 2026 г.

У савет па абароне дысертацый Д 02.21.03
пры установе адукацыі «Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

# ВОДГУК

апаніруючай арганізацыі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» на дысертацыю Калтачэнкі Аліны Ігараўны «Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

***Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны***

Дысертацыя А.І. Калтачэнкі «Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.» адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, галіне навукі – гістарычныя навукі ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджаным ВАК Рэспублікі Беларусь (загад № 180 ад 01.06.2022).

***Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы з адзнакай яго значнасці***

Асвятленне розных аспектаў гісторыі адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст. дагэтуль застаецца папулярнай тэмай навуковых даследаванняў, як у айчыннай, так і ў замежнай гістарыяграфіі. Тлумачыцца гэта важнасцю разумення сутнасці працэсу выхавання тагачаснай моладзі для агульнага асэнсавання спецыфікі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця ўсяго Вялікага княства Літоўскага. Замежныя падарожжы ў той час з’яўляліся заключным этапам у падрыхтоўцы юнакоў да сталага жыцця. Яны дазвалялі ўдасканаліць сваё веданне старажытных ды сучасных моў, красамоўства, правазнаўства, ваеннай навуцы і г.д. Да таго ж падобныя вандроўкі пашыралі кругагляд і дазвалялі завесці карысныя знаёмствы ў колах еўрапейскай арыстакратыі. Надзвычай запатрабавана гэта было менавіта для айчыннай правячай эліты – магнатэрыі, якая сканцэнтравала ў сваіх руках рэальную ўладу ў краіне. На гэтым фоне дысертацыя А.І. Калтачэнкі, безумоўна, актуальна для сучаснай гістарычнай навуцы, бо дазваляе лепш уявіць ступень падрыхтоўцы высакародных асоб, якія займалі ў азначаны перыяд адказныя дзяржаўныя ды вайсковыя пасады і такім чынам уплывалі на ўнутраную і знешнюю палітыку

сваёй дзяржавы. Нягледзячы на відавочную актуальнасць тэмы дысертацыі, у сучаснай гістарыягрыяфіі яна не стала прадметам асобнага комплекснага аналізу, што прыдае працы А.І. Калтачэнкі навуковую навізну ў плане ўсебаковага даследавання самой з'явы адукацыйных падарожжаў магнатаў з вызначэннем іх адметнасцяў ды эвалюцыі зместу на XVI–XVIII стст.

***Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук***

Дысертацыя А.І. Калтачэнкі ўяўляе сабой першае ў айчыннай гістарыяграфіі комплекснае даследаванне адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст. з грунтоўнай характарыстыкай аўтарскіх канцэптуальных і метадалагічных падыходаў, што складае навуковую навізну прадстаўленай працы.

У адпаведнасці з пп. 20-21 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў» Аліна Ігараўна Калтачэнка заслугоўвае прысуджэння ёй вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за наступныя навуковыя вынікі:

- выяўленне фактараў, што абумовілі складвання з'явы адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сямей ВКЛ у XVI ст., аналіз працэсу развіцця гэтай практыцы ў XVII ст. і яе трансфармацыі ў XVIII ст.;
- вызначэнне спецыфічных рыс адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ у XVI-XVIII стст.: індывідуальны характар кожнага адукацыйнага падарожжа, наяўнасць у асобных выпадках світы, якая фарміравала своеасаблівы "перасоўны двор", залежнасць маршрута падарожжа ад канфесійнай прыналежнасці магнацкай сям'і, а пазней і ад палітычнай арыентацыі рода;
- раскрыццё спецыфікі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў ВКЛ на падставе мемуарных і эпісталярных крыніц, што знайшло сваё ўвасабленне ў рэканструкцыі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў кн. Сапег у першай чвэрці XVII ст. і кн. Радзівілаў у апошняй чвэрці XVII ст.

***Заўвагі па дысертацыі***

Па-першае, пэўныя пытанні выклікае ўжыванне А.І. Калтачэнкай у назве сваёй дысертацыі тэрміна "універсітэт", бо ў аўтарэфераце яна прызнае, што будзе: "улічваць усе еўрапейскія навучальныя ўстановы, якія цікавілі прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў ВКЛ" (с. 3), а таксама адзначае: "размежаванне сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў яшчэ ў XVII ст. было дастаткова ўмоўным" (с. 2). У тэксце ж дысертацыі прысутнічаюць і іншыя найменаванні. Так, навучальную ўстанову ў Страсбургу, у часы знаходжання там кн. М.К. Радзівіла Сіроткі ў 1563–1564 гг., А.І. Калтачэнка называе і акадэміяй, і гімназіяй (с. 34), хоць вышэй сама адзначае, акадэмічны статус яна атрымала толькі ў 1566 г. (с. 30). Згадваюцца ў дысертацыі: ваенная акадэмія ў Турыне (с. 49), калегіўмы ў Браунсбергу (с. 34), Грацы (с. 53), Рыме (с. 65) і Мюнхене (с. 99). Раздзел 3.1. пачынаецца з фразы: "Традыцыя выезду ў еўрапейскія ўніверсітэты і акадэміі існавала фактычна ў кожнага магнацкага роду" (с. 52).

Зыходзячы з усяго гэтага, верагодна, назва дысертацыі больш карэктна гучала б наступным чынам: “Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага княства Літоўскага ў навучальныя ўстановы Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.”.

Па-другое, першая задача, пастаўленая перад дысертацыяй А.І. Калтачэнкай наступная: “Выявіць і прааналізаваць прычыны ўзнікнення з’явы адукацыйных падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.”. Разам з тым, як “з’ява” адукацыйныя падарожжы з тэрыторыі Беларусі сталі звычнай справай ужо ў XV ст. Толькі ў Кракаўскую акадэмію ў 1400-1499 гг. было залічана звыш 200 юнакоў з ВКЛ. Што ж датычыцца, прадстаўнікоў магнатаў, то згодна тутэйшых матрыкулаў, не менш 7 прадстаўнікоў княскага роду Гедройцаў атрымалі адукацыю ў старадаўняй сталіцы Польшчы: Герман (1419; 1426 – бакалаўр; 1433 – магістр), Альберт (1460; 1464 – бакалаўр), Міхаіл Мікалай (1461; 1465 – бакалаўр), Габрыэль (1472; 1475 – бакалаўр), Георгій (1475, 1477 – бакалаўр), Станіслаў (1490) і Мікалай (1499). У 1476 г. сюды быў залічаны Андрэй Петкавіч з роду кн. Свірскіх (1478 – бакалаўр). Скіраваў у Кракаў сваіх сыноў кашталян віленскі, намеснік гродзенскі кн. А.Ю. Гальшанскі. Першым, у 1488 г. у акадэмію трапіў Януш, у далейшым заняўшы пасады намесніка скідзельскага і старосты слонімскага, а таксама крайчага вялікага ВКЛ. У 1504-1507 гг. на філасофскім факультэце вучыўся яго малодшы брат – будучы віленскі біскуп Павел. Цалкам верагодна, што залічаны ў акадэмію у 1455 г. Марцін сын Андрэя з Геранёнаў (1458 – бакалаўр) – гэта будучы ваявода кіеўскі і троцкі М. Гаштольд. Пры гэтым, трэба прызнаць, што паездкі ў больш аддаленыя рэгіёны (Чэхія, Італія) мелі тады спарадычны характар і набылі рэгулярны характар толькі ў XVI ст. Менавіта таму, пастаўленая перад дысертацыяй задача больш дакладна гучала б, калі гаворка ў ёй ішла аб выўленні прычын перарастання практыцы адукацыйных падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст. у агульнапрынятую тэндэнцыю з дастаткова вялікай колькасцю ўдзельнікаў і шырокай геаграфіяй вандровак.

Па-трэцяе, не зусім дакладна асветлены прычыны ўсплеска цікавасці да адукацыйных падарожжаў у асяроддзі айчыннай магнатэрыі ў XVI ст. Пры абгрунтаванні канцэпцыі і храналагічных рамак даследавання акцэнт робіцца на: “пранікненне і распаўсюджанне ў ВКЛ ідэй Рэнесансу” (с. 7, 25-26). Разам з тым, у дысертацыі А.І. Калтачэнка цалкам слушна адзначае, што рэальныя змены ў заходнееўрапейскай педагогіцы ажыццявілі не гуманісты, а пратэстанты (с. 29-30). Як след гэтага, змены ў стаўленні да ўспрыняцця сапраўднай адукаванасці ў XVI ст. заклалі менавіта яны праз пашырэнне дактрыны “хрысціянскага гуманізма”, дзе антычная спадчына была арганічна спалучана з канонамі св. Пісання. Менавіта такі падыход прыйшоўся да спадобы еўрапейскай правячай эліты, у тым ліку і ў ВКЛ.

Па-чацвёртае, ва ўводзінах А.І. Калтачэнка піша: “Адукацыйныя падарожжы прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў у еўрапейскія ўніверсітэты дазволілі далучыць ВКЛ да традыцыі еўрапейскай адукацыі і еўрапейскай культуры… адбываўся транзіт ідэй, і эліта была правадніком агульнаеўрапейскай культуры ў ВКЛ, праводзіла рэформы ў культурнай, рэлігійнай і эканамічнай сферах,

паступова мяняла палітычны ландшафт дзяржавы" (с. 4). З дадзенага сцвярджэння ствараецца ўражанне, што падобныя вандроўкі ў XVI–XVIII стст. насілі выключна элітарны характар і абмяжоўваліся даволі рэдкімі і нерэгулярнымі выездамі за мяжу высакародных юнакоў (згодна дысертацыі каля 200 за амаль 300 год ды яшчэ і з практыкай групавых паездак). На самой справе, вандроўкі з адукацыйнымі мэтамі з тэрыторыі ВКЛ у цэлым і Беларусі ў прыватнасці мелі куды, як большыя маштабы. У дысертацыі не прааналізаваны непасрэдна тэксты тагачасных матрыкулаў універсітэтаў Кракава, Кенігсберга, Вітэнберга, Інгальштдта, у якіх значная частка "ліцвінаў" гэта незаможная шляхта, а часам і мяшчане (той жа Ф. Скарына). Да таго ж, з 1620-х гг. існавалі стыпендыяльныя фонды ў кальвіністаў ды ўніятаў, якія бясплатна адпраўлялі сваіх лепшых выхаванцаў у еўрапейскія навучальныя ўстановы. У выніку, за мяжой штогод знаходзіліся дзясяткі выхадцаў з ВКЛ, якія ў далейшым працавалі святарамі, настаўнікамі, а таксама сакратарамі і гувернёрамі ў тых жа магнатаў. Усе яны разам і сталі носьбітамі еўрапейскай культуры ў айчынным грамадстве. Замежныя ж падарожжы магнатаў ВКЛ спрыялі найперш высокаму ўзроўню гуманітарнай адукаванасці правячай эліты, але не прывялі, нажаль, да ажыццяўлення тут палітычных ці эканамічных рэформ па ўзору тых еўрапейскіх краін, якія яны наведалі ў маладосці.

Па-пятае, больш грунтоўна можна было б прааналізаваць і змены ў характары замежных падарожжаў магнатаў у XVIII ст. А.І. Калтачэнка адзначае, што ў дадзены час яны: "ўсё часцей гублялі свае адукацыйныя мэты і пераўтвараліся ў прыемнае баўленне часу… Магнаты ВКЛ таксама пераймалі новыя тэндэнцыі і пачыналі разумець гранд тур як падарожжа з мэтай фарміравання добрага густу, цікавасці да старажытнай гісторыі і археалогіі… ў другой палове XVIII ст. у Еўропу з мэтай адукацыі ехалі адзінкі, пры гэтым фактычна адзінай адукацыйнай мэтай былі ваенныя школы і акадэміі" (с. 45, 48, 49). З усяго гэтага яна робіць выснову пра тое, што: "К XVIII ст. цэнтрамі адукацыі сталі спецыяльныя рыцарскія школы, якія прапаноўвалі больш кароткія, насычаныя і практычныя курсы. У 40-х гг. XVIII ст. такія школы пачалі адкрывацца ў Рэчы Паспалітай, і на гэтым фоне адбыўся спад цікавасці да замежных падарожжаў" (с. 114). Нажаль, у дысертацыі самі гэтыя Рыцарскія акадэміі не прааналізаваны. Па-за межамі ўвагі засталіся падобныя навучальныя ўстановы ў Дрэздэне і Легніцы (згадваюцца толькі у якасці месцаў праезду – с. 23, 49, 53. 68, 74, 108), дзе дарэчы фіксуюцца і прадстаўнікі айчыннай правячай эліты – у першай з іх, напрыклад, вучыліся маршалак надворны ВКЛ, стараста мінскі І. Завіша ды троцкі ваявода кн. Й.Т. Агінскі (1717), а ў другой – канюшы ВКЛ, староста мінскі, генерал-лейтэнант кавалерыі ВКЛ кн. У.Кр. Радзівіл (1729-1730). Прычым, Дрэздэнская Шляхетная школа была створана Аўгустам II з мэтай станоўча паўплываць на падрастаючае пакаленне будучай правячай эліты Рэчы Паспалітай. Па падліках польскіх гісторыкаў да 1760-х гг. праз яе сцены прайшло да 500 высакародных юнакоў з каронных і вялікакняскіх земляў. Не меншае значэнне мела і Дваранская кадэцкая школа ў Люнэвіле пад Нансі, адкрытая з тымі ж мэтамі, што і папярэдняя, экс-каралём Станіславам Ляшчынскім. У

дысертацыі яна згадваецца (с. 44), але не адзначаецца, што тут мелася 12 штогадовых стыпендый для ўраджэнцаў ВКЛ і да 1766 г. яе скончыла 167 юнакоў з Рэчы Паспалітай. Яе ж значэнне для айчыннага грамадства выдатна адлюстравана ў мемуарах брэсцкага кашталяна М. Матушэвіча. Азначаныя школы не мелі выключную ваенную спецыялізацыю, а давалі яшчэ і грунтоўную агульнаадукацыйную падрыхтоўку. Менавіта таму наведванне навучальных устаноў у Дрэздэне і Люнэвіле было больш уласціва прыхільнікам рэформ Рэчы Паспалітай, але ў адпаведным раздзеле дысертацыі (3.2.) гэта не адзначана. Таксама яны праігнараваны і пры аналізу найбольш прывабных для магнатаў заходнееўрапейскіх асветніцкіх асяродкаў (3.1.). Такім чынам, разглядаючы адукацыйныя падарожжы магнатаў у XVIII ст. хутчэй трэба гаварыць не аб іх заняпадзе, а трансфармацыі пад уплывам, як эпохі Асветніцтва, так і крызісу феадальнага ладу. Магнатам для кар’еры ужо не было патрэбна дасканалае красамоўства і веданне антычнай спадчыны – куды важней была заможнасць, а тэксты прамоў ім пісалі дасведчаныя сакратары. На першае ж месца выходзяць альбо патрыятычнае жаданне ўдасканаліць сваю дзяржаву, альбо атрыманне асалоды ад уласнай эрудыцыі.

Такім чынам, відавочна, што існуюць напрамкі, па якім можна ўдасканаліць дысертацыю А.І. Калтачэнкі. Аднак, хочацца яшчэ раз падкрэсліць, што гэтыя заўвагі ні ў якім разе не зніжаюць яе відавочнай навуковай вартасці і не ўплываюць на асноўныя палажэнні ды высновы. Навуковая работа ў цэлым выклікае станоўчае ўражанне і безумоўна заслугоўвае права на высокую адзнаку.

***Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую яна прэтэндуе***

Праведзеная А.І. Калтачэнкай самастойная навукова-даследчая работа сведчыць аб тым, што яна дасканала і глыбока засвоіла прынцыпы работы з архіўнымі ды апублікаванымі крыніцамі, здольна да выпрацоўкі лагічных і дасканалых абагульняючых высноў, а таксама да працы з вялікім масівам фактычнага матэрыялу. Зыходзячы з аналізу тэкста дысертацыі і аўтарэферата, высокага ўзроўню выкарыстання аўтарам разнастайных метадаў навуковага пазнання, дазваляе сцвярджаць, што навуковая кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

***Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў***

Практычная значасць дысертацыі А.І. Калтачэнкі, яе палажэнняў і высноў ў першую чаргу заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання для выдання тэматычнай навуковай манаграфіі, а таксама шэрагу артыкулаў па праблеме мінулага адукацыі на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, апублікаваныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па гісторыі культуры Беларусі, універсітэтазнаўству і інш.

***Заключэнне***

У адпаведнасці з загадам першага прарэктара установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» водгук быў падрыхтаваны экспертам – кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, дацэнтам кафедры эканамічнай гісторыі Сацыяльна-эканамічнага факультэта Самусікам

Андрэям Фёдаравічам і абмеркаваны на пасяджэнні навуковага семінару кафедры эканамічнай гісторыі Сацыяльна-эканамічнага факультэта установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» (пратакол № 6 ад 14 студзеня 2026 г.).

Саіскальнік А.І. Калтачэнка выступіла з дакладам па дысертацыі. На паседжанні навуковага семінару адбылася дыскусія, саіскальнік аргументавана адказала заўвагі эксперта і зададзеныя прысутнымі пытанні.

На пасяджэнні навуковага семінару кафедры эканамічнай гісторыі Сацыяльна-эканамічнага факультэта установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» прысутнічала 9 чалавек, з іх кандыдатаў гістарычных навук – 9. Па профілю дысертацыі (07.00.02 – айчынная гісторыя) і блізкіх спецыяльнасцей на пасяджэнні навуковага семінару прысутнічала 9 спецыялістаў. Вынікі адкрытага галасавання членаў навуковага семінару па дысертацыі А.І. Калтачэнкі: «за» – 9; «супраць» – 0; «устрымаліся» – 0.

**ПАСТАНАВІЛІ:**

Зацвердзіць афіцыйны водгук на дысертацыю Калтачэнкі Аліны Ігараўны «Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.», прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Старшыня навуковага семінару,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры эканамічнай гісторыі
Сацыяльна-эканамічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага
эканамічнага ўніверсітэта Д.М. Чаркасаў

Эксперт па дысертацыі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі
Сацыяльна-эканамічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага
эканамічнага ўніверсітэта А.Ф. Самусік

Вучоны сакратар навуковага семінару,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі
Сацыяльна-эканамічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага
эканамічнага ўніверсітэта Г.В. Аляксашына